ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 33 (669) | Аўторак, 24 лістапада 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Мы—інтэрнацыяналісты*

## ДАПАМОЖАМ АФГАНСКІМ ДЗЕЦЯМ

У Клуб інтэрнацыянальнай дружбы нашага ўніверсітэта гэтымі днямі паступіў зварот ад калектыву гарнізоннага Дома афіцэраў абмежаванага кантынгенту савецкіх войск на тэрыторыі Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан. У ім паведамляецца аб тым, што ўжо больш сямі гадоў, як у гэтай краіне адбылася Красавіцкая рэвалюцыя. Працоўны афганскі народ будуе новае жыццё пры падтрымцы савецкіх людзей. Але становішча ў ДРА застаецца яшчэ цяжкім. Бандыты-наёмнікі перашкаджаюць свабоднаму Афганістану ісці па шляху выбранага дэмакратычнага развіцця. На рашучую барацьбу за бандытамі ўсталі ўсе прагрэсіўныя сілы рэспублікі. Значную дапамогу сваім бацькам і старэйшым братам аказваюць юнакі і дзяўчаты з дэмакратычнай арганізацыі моладзі Афганістана. Есць у рэспубліцы і піянерская арганізацыя.

На сённяшні дзень у Афганістане ўсяго толькі два Дамы піянераў. Адзін з іх знаходзіцца ў горадзе Пулі-Хумры. Тут працуюць гурткі чытання і правапісу, кройкі і шыцця, спартыўныя і іграўыя. Але матэрыяльная база Дома піянераў вельмі слабая. Савецкія воіны-інтэрнацыяналісты звяртаюцца да студэнцкай моладзі нашай краіны з заклікам аказаць афганскім школьнікам пасільную дапамогу ў яе ўмацаванні. Прапануецца збіраць і прысылаць у іх адрас спартыўны інвентар, цацкі, альбомы, фарбы, значкі, вымпелы, настольныя гульні.

Студэнтам універсітэта сабраныя падарункі для афганскіх піянераў дастаўляць для перасылкі ў інтэрклуб «Саюз» ГДУ.

*26-га лістапада—Дзень вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў*

# НЕЗАБЫЎНАЕ

У надзвычай цяжкіх умовах пачаліся і праходзілі баі за Гомельшчыну. Пацярпеўшы сакрушальнае паражэнне пад Курскам і перайшоўшы да стратэгічнай абароны, вораг імкнуўся любой цаной утрымацца на цэнтральным участку фронта і затрымаць наступленне Чырвонай Арміі. З гэтай мэтай нямецкае камандаванне разгарнула велізарныя па сваіх маштабах абаронныя работы на берагах Дзясны, Сожа і асабліва Дняпра, галоўнай часткі так званага Усходняга вала. Карыстаючыся адсутнасцю другога фронта, праціўнік перакінуў на ўзводзімы рубеж свежыя злучэнні з Заходняй Еўропы. Найбольш моцная абарона з вялікай фактычнай і аператыўнай насычанасцю была створана немцамі па Сожу, на ўчастку Гомель—Бабовічы. Не менш, чым на сваю абарону, гітлераўскія генералы разлічвалі на асенняе бездарожжа, якое стрымлівала наступленне савецкіх войск. Непрыступнасць Усходняга вала шырока рэкламавалася фашысцкай прапагандай. На адной з нарад у Берліне Гітлер заявіў: «Хутчэй Днепр пацячэ назад, чым рускія пераадолеюць яго». Але не было ўжо сілы, якая б магла спыніць нястрымны наступальны парыў доблесных савецкіх воінаў.

Войскі Беларускага фронта (да 20 кастрычніка Цэнтральнага) пад камандаваннем генерала арміі К. К. Ракасоўскага ў кастрычніку 1943 года з ходу фарсіравалі рэкі Сож і Днепр на ўчастку Бабовічы—Лоеў, стварыўшы плацдарм на заходнім беразе Дняпра. 10 лістапада з гэтага плацдарма пачалося ажыццяўленне Гомельска-Рэчыцкай аперацыі. Сіламі сямі сухапутных і адной паветранай армій галоўны ўдар наносіўся на Рэчыцу. Праз тыдзень савецкія войскі штурмам авалодалі Рэчыцай і Васілевічамі. Працягваючы наступаць у паўночным напрамку, часці Чырвонай Арміі выйшлі на рэчку Бярэзіна ў раёне Горваля.

Спробы фашысцкіх войск ударам з раёна Старых і Новых Барсукоў у напрамку населенага пункта Пасека адрэзаць часці Чырвонай Арміі, якія прарваліся да Рэчыцы, закончыліся няўдачай. На працягу 18—24 лістапада атакі нямецкіх войск на поўдзень ад Рэчыцы былі адбіты. У гэты ж час частка войск Беларускага фронта перайшла ў наступленне на ўчастку на захад ад Рудні ў напрамку да Яроміна, абыходзячы гомельскую варожую групоўку. Супрацьстаяць гэтаму націску фашысты не здолелі. Больш сямі дывізій праціўніка з часцямі ўзмацнення аказаліся амаль адрэзанымі з поўначы і захада. Імкнучыся пазбегнуць поўнага акружэння, нямецкія войскі, кідаючы тэхніку і ваенную маёмасць, пачалі паспешны адыход.

Раніцай 26 лістапада 217-я Унечская дывізія палкоўніка Масонава і 96-я стралковая дывізія палкоўніка Булатава з 11-й арміі хуткімі тэмпамі накіраваліся на паўночныя ўскраіны Гомеля. Адначасова з паўднёва-усходу ў горад уварваліся іншыя часці 11-й, а таксама 48-й армій. Над горадам запалымнелі два чырвоныя сцягі. Над паўразбураным памяшканнем электрастанцыі адзін з іх быў устаноўлены яфрэйтарам Васільевым і на пажарнай вышцы ў раёне цяперашняга паштамта — лейтэнантам Кірылюком, супрацоўнікам газеты «Знамя Советов» 11-й арміі.

822-дзённая гітлераўская акупацыя шматпакутнага горада закончылася. Вечарам 26 лістапада сталіца нашай Радзімы Масква громам артылерыйскага салюта апавясціла ўсёй краіне аб бліскучай перамозе войск Беларускага фронта, вызваліўшых ад фашысцкіх захопнікаў першы абласны цэнтр Беларусі — горад Гомель.

У выніку Гомельска-Рэчыцкай аперацыі войскі Беларускага фронта фарсіравалі рэкі Сож і Днепр, прайшлі на захад да 130 км, занялі выгадныя пазіцыі для далейшага вызвалення Беларусі. Часцям і злучэнням, якія праславіліся ў Гомельска-Рэчыцкай аперацыі, былі прысвоены назвы «Гомельскіх» і «Рэчыцкіх». Толькі за паспяховае фарсіраванне Дняпра ў раёнах Камарына і Лоева высокае званне Героя Савецкага Саюза атрымалі 595 салдат, сяржантаў, афіцэраў і генералаў Чырвонай Арміі. Тысячы савецкіх байцоў і камандзіраў, партызан Гомельскага і Палескага злучэнняў, якія аказалі вялікую дапамогу наступаўшым войскам Беларускага фронта, былі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі.

Шмат воінаў і народных мсціўцаў не дажылі да светлага дня вызвалення Гомеля. Яны загінулі на полі бою і ў фашысцкіх засценках. На тэрыторыі нашай вобласці шэсць савецкіх воінаў — радавыя Г. В. Масурадзе, Ф. Н. Мазілін, С. Д. Роман, лейтэнанты П. А. Мірашнічэнка, Н. П. Жуйкоў і капітан М. Г. Калінкін — паўтарылі подзвіг Аляксандра Матросава. Бясстрашныя лётчыкі — падпалкоўнік М. А. Крыўцоў са сваім экіпажам у саставе штурмана маёра І. І. Сомава і стралка-радыста старшыны Н. А. Паўлава, а таксама капітан К. Ф. Захараў і малодшы лейтэнант Ю. П. Шлыкаў—паўтарылі подзвіг слаўнага сына беларускага народа капітана Мікалая Гастэлы.

44 гады мінула з незабыўнага дня вызвалення Гомеля. Памяць аб яго вызваліцелях будзе заўжды жыць у сэрцах удзячных савецкіх людзей. Імёнамі герояў у горадзе над Сожам названы вуліцы і школы, кінатэатры і цеплаходы, піянерскія дружыны. На плошчы Працы барацьбітам за народнае шчасце ўзведзены велічны помнік. Каля яго падножжа — вечны агонь. Штодзённа каля магілы герояў, нязгасны подзвіг якіх заўсёды будзе служыць прыкладам беззапаветнай любві да Радзімы, піянеры і камсамольцы горада нясуць Вахту памяці. Тут заўсёды кветкі. Іх прыносяць разам з цеплынёй сваіх сэрцаў савецкія людзі, госці гамяльчан, замежныя дэлегацыі.

**Г. ЕЎДАКІМЕНКА,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт, старшыня ўніверсітэцкага Савета ветэранаў вайны і працы.**

# ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

У юбілейны для нашай краіны год — 70-годдзя Вялікага Кастрычніка—асабліва ярка выдзяляецца цесная сувязь і пераемнасць пакаленняў савецкіх людзей. Гэта адчулі ўдзельнікі сустрэчы са старым камуністам, актыўным удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, ветэранам працы дацэнтам Іванам Афанасьевічам Ільіных, якая адбылася нядаўна на кафедры палітэканоміі. На сустрэчу прыйшлі студэнты эканамічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў — члены студэнцкага навуковага гуртка, які працуе пры кафедры палітэканоміі, а таксама выкладчыкі.

Загадчык кафедры палітэканоміі дацэнт У. Ф. Бондараў расказаў пра слаўны жыццёвы шлях І. А. Ільіных — члена КПСС з 1924 года, які больш 30 гадоў працаваў у нашай ВНУ, а цяпер персанальнага пенсіянера. Але Іван Афанасьевіч не такі чалавек, каб сядзець без справы. Ён актыўна выступае перад студэнтамі і моладдзю горада са сваімі ўспамінамі з мэтай іх камуністычнага выхавання. Вось і на гэты раз І. А. Ільіных цікава і захапляльна расказаў аб шырокай партызанскай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Са снежня 1941 г. па кастрычнік 1943 г. ён партызаніў у бранскіх лясах, быў камандзірам палка партызанскай брыгады «За Радзіму». За свае баявыя заслугі І. А. Ільных узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны і многімі медалямі. Пра мужную барацьбу сваіх таварышаў па зброі ветэран ярка напісаў у сваёй кнізе «600 дзён у баях і паходах».

Студэнты і выкладчыкі цёпла падзякавалі І. А. Ільіных за яго хвалюючае выступленне, выказалі пажаданне рэгулярна сустракацца з ім у сценах універсітэта. Нягледзячы на сталы ўзрост (ветэрану ўжо 86 гадоў), Іван Афанасьевіч яшчэ бадзёры, энергічны, малады душой чалавек. У канцы сустрэчы ён пажадаў моладзі сваёй добрасумленнай працай, старраннай вучобай памнажаць дасягненні нашай Радзімы.

Затым пачаліся заняткі ў студэнцкім навуковым гуртку. Аб навуковых напрамках работы кафедры палітэканоміі расказалі студэнтам яе загадчык дацэнт У. Ф. Бондараў і асістэнт Н. Ю. Дзмітрыева. С. н. с. кафедры галіновых эканомік І. М. Есафаў, абапіраючыся на свой вопыт, расказаў членам гуртка аб методыцы работы над студэнцкай навуковай тэмай. Ігар Міхайлавіч з адзнакай закончыў завочны факультэт нашага ўніверсітэта і яшчэ ў студэнцкія гады актыўна ўдзельнічаў у навуковай рабоце, стаў лаўрэатам рэспубліканскага тура IX Усесаюзнага агляду-конкурсу студэнцкіх работ па грамадскіх навуках.

**Л. БАРСУКОВА,**
**стараста студэнцкага навуковага гуртка, другакурсніца эканамічнага факультэта.**




**НА ЗДЫМКУ:** ветэран Вялікай Айчыннай вайны, персанальны пенсіянер І. А. Ільіных гутарыць з загадчыкам кафедры палітэканоміі дацэнтам У. Ф. Бондаравым, с. н. с. кафедры галіновых эканомік І. М. Есафавым, членамі студэнцкага навуковага гуртка.

Фота Л. Акінчыц.

# *Віншуем!*

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, калектыў кафедры батанікі і фізіялогіі раслін горача віншуюць загадчыка гэтай кафедры дацэнта **САПЕГІНА** Леаніда Міхайлавіча з прысуджэннем яму ВАКам вучонай ступені доктара біялагічных навук.

* * *

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра алгебры і геаметрыі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры **СІДАРАВА** Аляксандра Уладзіміравіча з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

# З 23-га па 29-га лістапада—«Дні эканаміста»

## ВІНШУЕМ ВЫКЛАДЧЫКАЎ, СУПРАЦОЎНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ ЭКАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА. ЖАДАЕМ ПОСПЕХАЎ У ПРАЦЫ І ВУЧОБЕ!

**Учора на эканомфаку ГДУ пачаліся традыцыйныя «Дні эканаміста». Сёлета яны праводзяцца ўжо ў 17 раз. Цікавая традыцыя, якая нарадзілася разам з самім факультэтам у 1970 годзе, жыве і набывае новыя рысы, адметнасці, і для ўсіх выкладчыкаў, студэнтаў традыцыйныя дні становяцца сапраўдным святам. А ў іх прынята нагадваць усё самае памятнае, што было ў жыцці за мінулы час, звяраць яго з сённяшнім днём і заглядваць у будучае.**

**Пра ўсё гэта і раскажуць змешчаныя на гэтай старонцы газеты матэрыялы.**

## АЗІРНЕМСЯ НА ПРОЙДЗЕНЫ ШЛЯХ

У 1970 годзе эканамічны факультэт прыняў сваіх першых студэнтаў. Спачатку тут была адкрыта толькі адна спецыяльнасць — эканомікі працы. Пазней прыбавілася яшчэ адна. Па ёй рыхтуюцца інжынеры па механізаванай апрацоўцы эканамічнай інфармацыі. У першыя гады набор студэнтаў быў невялікім. Аднак камсамольская арганізацыя маладога эканомфака пераўзыходзіла сваёй баявітасцю значна большыя па колькасці членаў ВЛКСМ арганізацыі іншых факультэтаў ГДУ. Узначальваў яе тады Аляксандр Сасноў. Сярод студэнтаў таго часу было вельмі шмат ініцыятыўных, энергічных рабят, якія стаялі ля вытокаў усіх тых добрых традыцый факультэта, якія жывуць і сёння. Конкурс «Ану, першакурснікі!» нарадзіўся на эканамічным факультэце, а праз два гады яго сталі праводзіць у маштабе універсітэта. Па-сапраўднаму баявітым быў насценны друк эканомфака: рэгулярныя выпускі газеты «Эканаміст», гумарыстычны дадатак да яе «ЭВМ» (эліксір вясёлых мінут) змяшчалі цікавую інфармацыю аб усім, чым жылі будучыя эканамісты, аб тым, што перашкаджала паспяховаму авалоданню выбранай прафесіяй. Першым рэдактарам газеты «Эканаміст» быў Вячаслаў Наважылаў, цяпер ён — начальнік аддзела арганізацыі працы і заработнай платы аўтарэмзавода г. Гомеля. Надзвычай шырока расказвалі будучыя эканамісты аб справах факультэта на старонках універсітэцкай шматтыражнай газеты. У самых розных універсітэцкіх конкурсах, якія праводзіліся паміж факультэтамі, эканомфак быў заўсёды ў ліку лепшых. У клопатах аб тым, каб факультэт жыў насычана, цікава, знаходзіліся яго такія актывісты як А. Цімашэнка, В. Петэрсон, М. Рэзнікаў, В. Каротчыкаў і многія іншыя рабяты.

З першых гадоў існавання факультэта тут склаўся моцны калектыў выкладчыкаў, які быў здольны рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі. З таго часу і па сённяшні дзень працуюць тут прафесар, цяпер дэкан факультэта У. Д. Арэшчанка, дацэнты А. І. Максімовіч, Т. Д. Трацэўская, с. н. с. Э. І. Лізарава. Добрым кіраўніком, арганізатарам з'яўляўся ў гады станаўлення эканомфака яго былы дэкан І. П. Трацэўскі.

Факультэт рос, сталеў, яму былі неабходны новыя выкладчыцкія кадры. Іх папоўнілі выпускнікі В. Трухаў, Т. Асяніна, Т. Голубева (Цімашэнка), В. Борсук.

За 13 гадоў пасля першага выпуску нямала выхаванцаў эканомфака сталі кіраўнікамі важнейшых звенняў на прадпрыемствах горада, вобласці, рэспублікі. Так, на большасці прадпрыемстваў г. Гомеля эканамічныя службы прадстаўляюць нашы выпускнікі. Валерый Петэрсон — начальнік планава-эканамічнага аддзела абласнога ўпраўлення жылкамгаса, Уладзімір Цімашэнка стаў генеральным дырэктарам аб'яднання будматэрыялаў упраўлення мясцовай прамысловасці, Анатоль Сенін узначальвае жыллёва-рамонтна - эксплуатацыйны трэст пры Савецкім райвыканкоме, Аляксандр Казакоў — начальнік аддзела арганізацыі працы і заработнай платы ўпраўлення «Гомельэнерга». Сказаць аб усіх, хто дасягнуў поспехаў у сваёй працы, проста немагчыма. Многія выпускнікі розных гадоў звязалі свой лёс з выхаваннем, навучаннем будучых эканамістаў. Сярод іх В. С. Каржоў, Т. І. Іванова, Л. С. Фядосенка, Г. М. Коўзік, У. І. Бобрык, У. В. Зарэцкі, В. В. Клыга, У. А. Чмых, Л. Я. Аксёнава і інш. У час вучобы некаторыя студэнты паказалі выдатныя арганізатарскія здольнасці, і цяпер яны працуюць на партыйнай і камсамольскай рабоце. Так, Алена Лявонава з'яўляецца сакратаром Чыгуначнага РК КПБ, Вячаслаў Асіпенка — першы сакратар гаркома камсамола.

Цяпер на факультэце налічваецца пяць кафедр — эканомікі працы, АМАЭІ, галіновых эканомік, ТСАЭІ, аналізу гаспадарчай дзейнасці, якімі кіруюць адданыя сваёй справе людзі, і дзе працуюць 4 прафесары, 3 дактары навук, 18 кандыдатаў навук.

Гісторыя існавання эканамічнага факультэта не такая ўжо і вялікая — 17 гадоў. Але за гэты час ён здолеў стаць адным з вядучых ва універсітэце.



Гэты здымак быў зроблены летам 1976 года. Каля Маўзалея У. І. Леніна — інтэрнацыянальны СБА, байцамі якога ў пераважнай большасці з'яўляліся студэнты эканамічнага факультэта.

*Мы — з 80-х*

## НЯХАЙ НЕ ПАТУХНЕ ІСКРЫНКА

Студэнт 80-х гадоў... Які ён? Чым адрозніваецца ад нашых папярэднікаў? Што ў сённяшнія дні з'яўляецца найбольш характэрным для яго?

Адназначна на гэтыя пытанні не адкажаш. Калі ж гаварыць аб вучобе сённяшняга студэнта, аб адносінах яго да свайго галоўнага абавязку, то трэба адзначыць, што ў пэўнай часткі юнакоў і дзяўчат гэтыя адносіны сталі менш сур'ёзнымі, чым у студэнтаў 60-х і 70-х. Сведчаннем таму была пераважная колькасць пасрэдных адзнак пасля экзаменаў, шмат «хвастоў», якія некаторыя студэнты цягнулі за сабой з курса на курс. План выпуску спецыялістаў, які даводзіўся раней навучальным установам, безумоўнае яго выкананне, урэшце, прывялі вышэйшую школу да таго, што студэнт-двоечнік адчуваў сябе беспакараным і ў выніку цягнуў уніз працэнт паспяховасці свайго факультэта ды і наогул навучальнай установы. Пачатая ў краіне перабудова вышэйшай школы прымушае такіх студэнтаў пераглядаць свае адносіны да вучобы. Тыя ж, хто гэтага не зробіць, апынуцца па-за сценамі універсітэта.

Радуе атмасфера нецярпімасці да гультаёў, вецер перамен ачышчае ад застою, бюракратызму, заарганізаванасці ў камсамольскай, грамадскай рабоце. Бачна, як студэнт, раней пасіўны і абыякавы да ўсяго, выказвае ўсё тое, што яго хвалюе, уносіць прапановы. Аб гэтым яскрава сведчыць апошні справаздачна-выбарны камсамольскі сход факультэта.

Са слоў выкладчыкаў факультэта, якія працуюць тут з першых дзён яго заснавання, студэнты таго часу былі больш энергічнымі, актыўнымі ва ўсіх сферах жыцця эканомфака. Сённяшнія ж студэнты — 80-х гадоў — такой актыўнасці не праяўляюць, за выключэннем нямногіх з іх. Не можам з імі не згадзіцца. Так, многіх яшчэ трэба доўга, як кажуць, разварушваць, перш чым яны нешта зробяць дзеля агульнай справы факультэта. Напрыклад, перад канцэртамі, конкурсамі, што праводзяцца паміж факультэтамі універсітэта, тым, хто сапраўды даражыць гонарам эканомфака, даводзіцца доўга іх угаворваць прыняць удзел у гэтых мерапрыемствах, ці нават адміністрацыйнымі мерамі на іх уздзейнічаць. Такія толькі часта скардзяцца на тое, што жыццё студэнцкае сумнае, а зрабіць нешта на агульную карысць ім не хочацца. Ад такога ўтрыманства нам трэба пазбаўляцца. Ёсць жа ў нас з каго браць прыклад — і ў вучобе, і ў грамадскай рабоце. Так, гр. Т-31 заняла другое месца ва універсітэцкім аглядзе-конкурсе на лепшую акадэмічную групу, маюць добрыя адзнакі, актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце студэнты факультэта А. Лішык, І. Лапіцкая, А. Унукоўская, У. Лепшый і заўсёды гатовы абараніць гонар факультэта ў культурным жыцці А. Мяжэннікава, М. Васюк, В. Ігнатаў, В. Кавалёва, А. Хрыпунова, Н. Міхальчанка, І. Казлова, В. Харанека, Б. Клімовіч,

Дык хто ж мы, студэнты 80-х? Наогул, нядрэнныя людзі. Проста крыху замкнуліся ў сабе, у сваіх асабістых справах і інтарэсах. Нельга сказаць, што мы не таленавітыя. У нас ёсць іскрынка, пры загаранні якой можам зрабіць шмат карысных спраў. Неабходна, перш за ўсё, як кажуць, «разбудзіць» студэнта 80-х, каб ён перабудаваўся. Пачатак гэтай перабудовы паклаў спачатку XXVII з'езд КПСС, а затым XX з'езд ВЛКСМ. Трэба адзначыць, што рост актыўнасці сярод студэнтаў ужо назіраецца. Хочацца верыць: у хуткім часе на ўсіх канцэртах і ў конкурсах будучыя эканамісты пачнуць займаць зноў толькі прызавыя месцы. Натуральна, больш сур'ёзна яны будуць адносіцца і да вучобы.

*НАШЫ ІНТЭРВ'Ю*

## АДРАДЗІЦЬ БЫЛУЮ СЛАВУ

**Напярэдадні «Дзён эканаміста» было праведзена невялікае апытанне выкладчыкаў і студэнтаў факультэта.**

**На пастаўленыя перад імі пытанні даюць адказы дацэнт І. П. Трацэўскі, с. н. с. Э. І. Лізарава, асістэнт Т. І. Іванова, студэнтка 4-га курса А. Мяжэннікава.**

**Ігар Паўлавіч! На вашых вачах нараджаўся эканамічны факультэт, яго традыцыі. У той час, калі Вы былі дэканам, многія сотні студэнтаў прайшлі, як кажуць, праз вашы рукі. Як Вы лічыце, што змянілася ў студэнце эканомфака і якія найбольш выдатныя падзеі 70-х гадоў Вам памятаюцца і цяпер?**

— На жаль, няма цяпер у студэнтаў такога вялікага энтузіязму і гонару, які быў у той час за свой самы малады ў ГДУ факультэт. Аслаблены адносіны студэнтаў да вучобы, няма той ранейшай актыўнасці ў мастацкай самадзейнасці, насценны друк таксама здаў свае высокія пазіцыі.

Я ўдзельнічаў у падрыхтоўцы звыш 1600 студэнтаў стацыянара эканомфака, 300 — іншых факультэтаў ГДУ і яшчэ больш трох тысяч чалавек у Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце. Хачу адзначыць, што студэнт становіцца ўсё больш інфармаваным, патрабавальным, але... разам з тым, на мой погляд, менш працалюбівым, грамадска актыўным.

Памятаю першы выпуск факультэта 1974 года. Якія былі цудоўныя рабяты! І цяпер яны з гонарам апраўдваюць дыпломы першых выпускнікоў эканамічнага факультэта ГДУ.

**— Эма Іванаўна! Як часта Вы прымаеце ўдзел у традыцыйных «Днях эканаміста»? Што з іх Вам больш за ўсё запамяталася? Якія рысы, на Ваш погляд, адрозніваюць цяперашнія «Дні» ад мінулых?**

— Я была на ўсіх «Днях эканаміста». Яшчэ памятаю «Экошу» (на сцэне на стуле сядзеў намаляваны разумны хлопчык-эканаміст, на якім быў напісаны год яго нараджэння — нараджэння эканамічнага факультэта). Раней было нормай для выкладчыка ўдзельнічаць у традыцыйных днях. На канцэртах яны спявалі, чыталі вершы... На факультэце быў свой ВІА, вядомыя ўсяму г. Гомелю спявачкі-студэнткі. Заўсёды былі фатографы, адказныя за выпуск газеты, у арганізацыі свята прымалі ўдзел партыйнае, прафсаюзнае і камсамольскае бюро, іх прадстаўнікі прысутнічалі на ўсіх рэпетыцыях. Гэтае свята рыхтавалі ўсе! Затым — спад, фармалізм, самацёк. Спачатку не стала фатографаў, потым ансамбля, усё менш стала прыязджаць выпускнікоў мінулых гадоў. Аднак радуе, што адрадзіўся Клуб вясёлых і знаходлівых і ўжо ў новай форме: раней былі дзве студэнцкія каманды, а цяпер студэнты гуляюць супраць выкладчыкаў. Лічу, што гэты варыянт больш цікавы. І тым і другім трэба час ад часу развеяцца і адчуць, што мы ўсе сучаснікі.

**— Таццяна Іванаўна! Якім Вы ўяўляеце студэнта пачатку 90-х гадоў?**

— Больш сур'ёзным, добрасумленным, актыўным. Адрозніваць яго ад сучасных студэнтаў, на маю думку, будзе перш за ўсё, узровень ведаў і цікавасць да вучобы.

**Алена! Табе даводзіцца шмат працаваць у напрамку культурна-масавай работы на факультэце. Што цябе не задавальняе ў сённяшнім студэнце?**

— Пытанне грамадскай актыўнасці студэнтаў, на мой погляд, ніколі не зыходзіла з парадку дня. А сёння — я мяркую па нашаму факультэту — гэта вельмі набалелае пытанне. Хто займаецца грамадскай работай? Адзінкі. Усе астатнія спачываюць на лаўрах. А ў большасці выпадкаў, нават не цікавяцца гэтымі лаўрамі: поўная абыякавасць да праблем свайго факультэта.

Памятаю першую лекцыю, якую я слухала, як толькі паступіла ва універсітэт. Намеснік дэкана М. В. Герасімчык сказаў тады: «Эканаміст — гэта перш за ўсё арганізатар, узброены ведамі». Гэтыя два моманты неаддзельныя адзін ад аднаго: нам не патрэбна бесталковая арганізацыя, як не патрэбны і пасіўныя веды, веды без умення іх актыўнага прымянення. Менавіта гэтым і «хварэе» наша студэнцтва.

МАТЭРЫЯЛЫ СТАРОНКІ ПАДРЫХТАВАНЫ ПРЭС-ЦЭНТРАМ ЭКАНАМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.

*«Беларуская музычная восень»*

# ЧАКАЕМ НА КАНЦЭРТАХ

У культурным жыцці нашага горада — знамянальная падзея. Чатырнаццаты раз прыйшло на Гомельшчыну свята мастацтваў: Усесаюзны фестываль «Беларуская музычная восень». У госці да гамяльчан і працаўнікоў вобласці прыехалі творчыя калектывы і выканаўцы з многіх брацкіх рэспублік і сацыялістычных краін.

На канцэртных пляцоўках горада выступілі ўжо нашы госці з Балгарыі — ансамбль духавой музыкі «Поліфанія», артысты Свярдлоўскай абласной філармоніі — секстэт народных інструментаў «Аюшка», саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Латвійскай ССР, лаўрэат міжнародных конкурсаў, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Латвіі, заслужаны артыст Латвійскай ССР Сяргей Мартынаў, заслужаны артыст РСФСР піяніст В. Бярзон з Ленінграда, іншыя калектывы.

Цікавымі высокапрафесіянальнымі калектывамі прадстаўлена на фестывалі харавое мастацтва. Сёння і заўтра ў музвучылішчы імя Н. Ф. Сакалоўскага выступіць Маскоўскі камерны хор пад кіраўніцтвам лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, прафесара В. Мініна. Цікавы і разнастайны рэпертуар, пошук новых форм харавога выканання дазваляюць гаварыць аб ім як аб калектыве сапраўды сучасным: творы глыбокай даўніны — выдатныя помнікі музычнай культуры рускага народа арганічна спалучаюцца з творамі нашых сучаснікаў. Хор выконвае творы вядомых аўтараў XVI ст., выдатных кампазітараў XVI—XVII ст., шэдэўры харавой музыкі XIX ст. і інш.

Адзін з самых папулярных калектываў Масквы — Дзяржаўны камерны хор пад кіраўніцтвам лаўрэата Міжнароднага конкурсу Валерыя Палянскага запрашае на свой канцэрт 28 лістапада (актавая зала ГДУ). У 1975 г. на міжнародным конкурсе ў Італіі хор удастоен залатога медаля і звання лаўрэата. Маскоўскі кампазітар Н. Сідзельнікаў напісаў для калектыву кантаты на народныя тэксты і вершы Гарсіа Лоркі.

Шматлікія канцэрты, запісы і грампласцінкі, сумесныя праграмы з вядучымі сімфанічнымі і камернымі калектывамі, зарубежныя гастролі — вось няпоўны пералік творчай дзейнасці гэтага калектыву.

Чакаем вас на канцэртах фестывалю.

**Л. БАЛАЖ,**
**рэдактар абласной філармоніі.**

# ДОНАРАЎ ШЧОДРЫЯ СЭРЦЫ



**У гэтым месяцы ва універсітэце** праходзілі «Дні донара». Многія студэнты, супрацоўнікі ГДУ прыйшлі на донарскі пункт, каб выканаць ганаровы і пачэсны абавязак— бясплатна даць сваю кроў, якая вельмі неабходна для выратавання жыцця людзей.

НА ЗДЫМКУ: пяцікурсніца фізічнага факультэта Людміла Маісеенка стала донарам шосты раз, а студэнтка гр. В-32 Святлана Абраменка — чацвёрты.

Фота Л. Акінчыц.

Спорт

# НА ПРЭСТЫЖНЫМ ТУРНІРЫ

Даўно сталі традыцыйнымі турніры па фехтаванню, якія штогод праводзяцца ў горадзе на Няве — Ленінградзе. Сёлета спаборніцтвы прысвячаліся 70-годдзю Вялікага Кастрычніка. У восьмы раз прыняла ўдзел у іх каманда нашага універсітэта. За ганаровыя прызы змагаліся мушкецёры з Масквы, Ленінграда, Бранска, Баку, Львова, Гомеля.

З вялікім поспехам выступілі шпажысты — студэнты факультэта фізвыхавання майстры спорту Ігар Папуленка, Аляксандр Стасенка, кандыдат у майстры спорту Уладзімір Смірноў. У сваім відзе зброі яны заваявалі камандную перамогу. Як заўсёды, упэўнена фехтаваў А. Стасенка, якому сёлета Спарткамітэтам СССР прысвоена ганаровае званне «Майстар спорту СССР». Зазначым, што гэта васемнаццаты фехтавальшчык, які дасягнуў такога спартыўнага ўзроўню, трэніруючыся пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання майстра спорту СССР В. Лісоўскага.

**(Наш кар.).**

# ДЛЯ ЮНЫХ МАТЭМАТЫКАЎ

**28 ЛІСТАПАДА ПАЧЫНАЕ СВАЮ РАБОТУ ШКОЛА «ЮНЫ МАТЭМАТЫК» ПРЫ МАТЭМАТЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ ГДУ. ШКОЛА БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ ПА НАСТУПНАМУ ПЛАНУ:**

| Дата | Тэма заняткаў. Прозвішча, імя, імя па бацьку выкладчыка |
|---|---|
| 28.11.78 г. | Лекцыя «Дакладныя і прыбліжаныя метады рашэння ўраўненняў» загадчыка кафедры матэматычнага аналізу, к. ф.-м.н., дацэнта І. М. Бруя. |
| 19.12.87 г. | Лекцыя прарэктара па вучэбнай рабоце, члена-карэспандэнта АН БССР, доктара ф.-м. н., прафесара Л. А. Шамяткова. |
| 09.01.88 г. | Лекцыя «Развіццё паняцця ліку. Комплексныя лікі» загадчыка кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў, к. ф.-м. н., дацэнта У. І. Міроненкі. |
| 13.02.88 г. | Лекцыя «Пачатак аналізу: простае рашэнне практычна значымых задач» дацэнта кафедры матэматычнага аналізу, к. п. н. А. У. Гаўрылюка. |
| 19.03.88 г. | Лекцыя «Імаверныя метады ў прыродазнаўстве і народнай гаспадарцы» загадчыка кафедры тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі к. ф.-м. н., дацэнта Ю. У. Малінкоўскага. |
| 16.04.88 г. | Лекцыя «Стэрэаметрычныя задачы на ўступных экзаменах» загадчыка кафедры матэматычнага аналізу к. ф.-м. н., дацэнта І. М. Бруя. |

Пачатак лекцыі 28 лістапада ў 17 гадзін 30 мінут, аўдыторыя 3—22 вучэбнага корпуса № 2 ГДУ (вул. Кірава, 119). Бліжэйшы прыпынак грамадскага транспарту — «вул. Кожара».

Магчымы перастаноўкі тэм заняткаў, а таксама ўвядзенне дадатковых тэм і форм заняткаў з улікам пажаданняў слухачоў.

Тэлефон для даведак: 57-30-51 (кафедра матэматычнага аналізу).

*Да 100-годдзя з дня нараджэння акадэміка М. І. Вавілава*

# БАТАНІК, ГЕНЕТЫК, АГРАНОМ

25 лістапада г. г. спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння акадэміка М. І. Вавілава — батаніка, генетыка, агранома, падарожніка.

Амаль усе сучасныя работы ў галіне філагенетыкі, прыкладной батанікі, селекцыі, раслінаводства праводзяцца пад непасрэдным уплывам яго ідэй як у нашай краіне, так і за рубяжом.

Яго ўклад у біялагічную навуку расцэньваюць нараўне з укладам Ч. Дарвіна, Г. Мендэля, К. Лінея.

Сваю шматгранную навуковую дзейнасць М. І. Вавілаў накіраваў на захаванне, памнажэнне і паляпшэнне раслінных багаццяў свету і забеспячэнне харчаваннем усяго насельніцтва планеты.

З 1920 па 1940 г. г. М. І. Вавілаў кіраваў шматлікімі батаніка-агранамічнымі экспедыцыямі як на радзіме, так і за мяжой. У выніку вывучэння розных відаў і сартоў раслін, сабраных у краінах усяго свету, ён устанавіў ачагі формаўтварэння або цэнтры паходжання культурных раслін.

Пад кіраўніцтвам М. І. Вавілава ў СССР была створана сусветная калекцыя культурных раслін, у якой утрымліваецца звыш 300 тысяч узораў. У гады Вялікай Айчыннай вайны гэта ўнікальная калекцыя насення засталася ў блакадным Ленінградзе, цаной жыцця вучоных генны банк зямлі быў захаваны.

Па ініцыятыве Вавілава быў арганізаваны цэлы рад новых навукова-даследчых устаноў: інстытуты зерневай гаспадаркі, пладаводства, гароднінаводства, субтрапічных культур, інстытуты кармоў, кукурузы, бульбы і інш.

М. І. Вавілаў з'яўляўся членам і ганаровым членам многіх замежных акадэмій — Англійскай, Індыйскай, Аргенцінскай, Шатландскай. Ён мужна адстойваў свае навуковыя перакананні ў барацьбе з нецярпімасцю і адміністрыраваннем у навуцы.

У 1965 г. устаноўлена прэмія імя М. І. Вавілава, а з 1967 г. Усесаюзны інстытут раслінаводства стаў насіць яго імя.

У бібліятэцы універсітэта на абанеменце № 1 можна пазнаёміцца з наступнымі працамі М. І. Вавілава і з літаратурай аб ім:

**ВАВІЛАЎ М. І.** Выбраныя працы: у 5 т. Т. 1—5 — М.—Л., АН СССР, 1959—1965.

**ВАВІЛАЎ М. І.** Закон гамалагічных радоў у спадчыннай зменлівасці. — Лінееўскі від як сістэма. — Л., Наука, 1967.

**ВАВІЛАЎ М. І.** Сусветныя рэсурсы сартоў хлебных злакаў, зерневых бабовых, ільну і іх выкарыстанне ў селекцыі — М. — Л., АН СССР, 1957.

**ВАВІЛАЎ М. І.** Пяць кантынентаў. — М., Географвыдат. — 1962.

Пытанні эвалюцыі, біягеаграфіі, генетыкі і селекцыі. Зборнік, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння акадэміка М. І. Вавілава. — М.—Л., АН СССР, 1960.

Свет ідэй Вавілава. Зб. артыкулаў. Складальнік А. Кантаровіч. — М., Знание, 1968.

**РЭЗНІК С. Е.** Мікалай Вавілаў. — М., Молодая гвардия, 1968.

**Ж. ЖЫЛІЦКАЯ,**
**ст. бібліёграф.**

# АЗНАЁМІЛІСЯ З МУЗЕЯМІ

Калі пачынаць знаёмства школьнікаў з прыродай роднага краю, з яго гісторыяй і культурай? Калі, нарэшце, пачынаць работу па прафесійнай арыентацыі? Настаўніцы СШ № 3 г. Гомеля Таццяна Іванаўна Пірагова і Валянціна Міхайлаўна Гарунова лічаць: чым раней, тым лепш. Нядаўна яны разам з вучнямі другіх класаў наведалі археалагічны і заалагічны музеі універсітэта. У археалагічным музеі яны ўбачылі разнастайныя экспанаты каменнага, бронзавага, ранняга жалезнага вякоў і эпохі Кіеўскай Русі, пазнаёміліся з цудоўнай навукай — археалогіяй, пачулі расказ пра шматлікія помнікі, экспедыцыі, у якія кожны год адпраўляюцца студэнты гістарычнага аддзялення ГДУ. А ў заалагічным музеі іх чакалі не менш цікавыя экспанаты — чучалы птушак, звяроў і інш.

**(Наш. кар.).**

## НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

**Ён знаёміць з творамі беларускіх народных умельцаў па дрэву, майстроў пляцення з саломы і лазы, ганчароў і ткачых XVI—XX ст. ст.**

**Дзяржаўны музей Беларускай ССР з'яўляецца адным з важнейшых сховішчаў прадметных і дакументальных матэрыялаў па айчыннай гісторыі, важнай культурна-асветнай установай. Яго экспанаты шырока прадстаўлены ў альбоме «Дзяржаўны музей Беларускай ССР».** — Мн., «Беларусь», 1986.

# УСЁ ПРА РОДНЫ КРАЙ

У шырокім выбары прадстаўлена сувенірная і краязнаўчая літаратура ў кнігарні № 19 па вул. Савецкай, 106.

Альбом **«Заслаўскі гісторыка-археалагічны запаведнік».**— Мн., «Беларусь», 1983.

У ім экспаніруюцца творы прыкладнога мастацтва, пластыкі, жывапісу, рамесныя вырабы са старажытных часоў і да пачатку XX стагоддзя. Стварэнне гісторыка-археалагічнага запаведніка ў старажытным Заслаўі мае вялікае значэнне і можа служыць прыкладам комплекснага рашэння пытанняў аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры ў рэспубліцы.

Альбом **«Музей беларускага народнага мастацтва».** — Мн., «Беларусь», 1983.

**«Жывыя фарбы батанічнага».** — Мн., «Беларусь», 1987.

Нямала цікавага і карыснага падорыць чытачу гэты альбом, пазнаёміць яго з асноўнымі экспазіцыямі: ландшафтным паркам, дэндрарыем, кветкава-дэкаратыўнымі калекцыямі.

У альбоме **«Спатканне з лесам»** (Мн., «Беларусь», 1986) з дапамогай фотаздымкаў паказана здзіўляючая прыгажосць і багацце беларускага лесу, схаванае ад вачэй жыццё многіх яго жыхароў. Усё, што ўвайшло ў яго, рабілася з вялікай любоўю.

**Г. ТАЛАШОВА,**
**прадавец кнігарні.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ ·86·
Аб'ём — 1 друк. арк.
Тыраж 2000 экз. Заказ 917